Людмила ШКЛЁДА

# Жаночае шчасце

Жаночае шчасце,
Якім ты бываеш?
Каму – як прычасце,
Каго – забаўляеш.

Жыцця адгалоскі,
Як вецер свавольны,
Хтось, з Божае ласкі,
Шчаслівай стаць здольны.

Пакуль сэрца роўна,
З надзеяй, так б'ецца,
Жанчына ўсё роўна
Да шчасця імкнецца.

У кожнай жанчыне
Свая таямніца,
Што нават мужчыне
Пра тое не сніцца.

Яе прыгажосцю,
З пяшчотай, Бог меціў
Як мілую госцю,
Як кветку расквеціў.

Ад гэтай загадкі
Нікуды не дзецца,
Мужчыне адгадкі
Шукаць давядзецца.

Ды гэта ж не крыўда,
Сакрэт тут ёсць дробны.
Жанчыны ўсе, праўда,
Зусім не падобны.

Адна – як царэўна,
Другія – як павы,
Ды лёс іх, напэўна,
Да ўсіх не ласкавы.

Шукае жанчына
Сваё ў жыцці шчасце,
Ёй стане мужчына
Як лёс, як прычасце.

Хай здзейсняцца мары
У кожнай жанчыны,
Рассеюцца чары
З каханнем мужчыны!